Падтрымай "Вясну" на PATREON

Затрыманні пасля “Марша недарамаедаў” у Маладэчне відэа дапоўнена

10.03.2017 **Тэгі**: свабода мірных сходаў, затрыманні



Журналісты і назіральнікі ў Маладэчанскім РАУСе

У Маладэчне ўвечары 10 сакавіка, у той час як удзельнікі “Маршу недармаедаў” разыходзіліся ад будынка падаткавай інспекцыі, дзе завершылася акцыя, пачаліся затрыманні.

Фактычна на вачах у назіральнікаў затрымалі 16-гадовага падлетка, які ішоў па вуліцы ў кампаніі з 5 -7 чалавек. Хлопца, які сярод іншых вылучаўся тым, што быў у арафатцы на твары, людзі ў цывільным жорстка запіхалі ў машыну і павезлі. Па словах яго спадарожнікаў, ён не вылучаўся грамадзянскай актыўнасцю, захапляецца спортам і музыкай.

Таксама паступіла інфармацыя пра затрыманне сацыял-дэмакрата **Алеся Абрамовіча**, які падчас мітынгу выступаў з мегафонам.

Апроч таго, стала вядома пра брутальнае затрыманне (закінулі у мікрааўтобус тварам у падлогу) мінскіх выступоўцаў – **Анатоля Лябедзькі**, **Юрася Губарэвіча**, **Віталя Рымашэўскага,** актывісткі БХД **Вольгі Кавальковай**. Усіх даставілі ў Маладэчанскі РАУС, дзе разбіральніцтва над імі адбываецца на чале з кімсьці з начальнікаў па прозвішчы **Кісель**.

АГП апублікавала відэа з затрымання мінскіх палітыкаў і журналіста БелаПАН **Сяргея Каралевіча**, якое здымаў Анатоль Лябедзька.



Журналістаў і назіральнікаў, якія прыйшлі ў Маладэчанскі РАУС, каб высветліць лёсы затрыманых, выгналі адтуль - "не зала чакання". Дзверы ў будынак РАУСа зачынілі.



За час дзяжурства пад РАУСам назіральнікі высветлілі, што па дарозе з акцыі былі затрыманыя яшчэ некалькі чалавек. Адзін з іх - **Ілля Бондар** (на здымку), якога выпусцілі з РАУСу раней, распавёў ім, што там знаходзяцца двое ягоных сяброў - **Яўген Радкевіч** і **Рыгор Аўсяннікаў** (усе поўнагадовыя)**,** і яшчэ некалькі чалавек, сярод якіх ёсць дзяўчына. Хлопец паведаміў, што на яго склалі пратакол па артыкуле 23.34 КаАП і падзяліўся тым, як "негасцінна" праводзілі іх затрыманне: ДАІ спыніла таксі, у якім яны вярталіся з мітынгу, тут жа пад'ехаў мікрааўтобус, у які хлопцаў закінулі, загадаўшы не падымаць галавы, білі, пры гэтым прычыну затрымання не патлумачылі.

Як стала вядома, раніцай 10 сакавіка быў затрыманы каардынатар БХД па Маладэчне **Раман Ганчароў**. Каля сутак пра яго не было ніякіх звестак, на запыт сваякоў у РАУС адказалі, што нічога не ведаюць. І толькі 11 сакавіка высветлілася, што яму далі 5 сутак арышту.

Твитнуть


#FREEVIASNA


Вясна. Правы чалавека ў …
9 958 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами


СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул
"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)
Чатырох жыхароў Паставаў асудзілі да "хатняй хіміі" за фотаздымак з Маршу (дапоўнена)
Заява праваабаронцаў аб прызнанні 20 палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17



ГАЛОЎНАЕ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі тэрмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

Да пяці гадоў калоніі. Асудзілі палітвязняў, якія вывесілі нацыянальныя сцягі Беларусі і Украіны

Дайджэст вызваленых: 12 палітвязняў у сакавіку цалкам адбылі тэрміны і выйшлі на волю

"Могуць з'яўляцца злачынствамі супраць чалавечнасці". Што азначае гэтая фармулёўка ў дакладзе ААН пра Беларусь?

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

Anti-Discrimination Centre memorial

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY